## ЧЫННІКІ ЯКАСЦІ АДУКАЦЫІ ВА ЎМОВАХ СУЧАСНЫХ ТРАНСФАРМАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ

*С.В. Снапкоўская*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка*
*Г.П. Арлова*
*Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П. М. Машэрава*

1. У сучасным свеце мы можам сустрэцца са шматлікімі ідэямі, якія вызначаюць накірункі грамадскага, гаспадарчага ці палітычнага развіцця свету. Аднак адной з найбольш значных сучасных ідэй з'яўляецца якасць – якасць вырабу, якасць у дзеянні ці апошнім часам якасць у адукацыі. Насуперак спадзяванням, паняцце якасці зусім не з'яўляецца чымсці новым. На працягу вякоў было сфармулявана шмат яе азначэнняў. Першае азначэнне якасці было сфармулявана яшчэ Платонам: «Якасць, як і прыгажосць, з'яўляецца ацэначнай думкай, выражанай спажыўцом. Калі няма спажыўца – няма і такой думкі». На погляд Арыстоцеля, «якасць – гэта тое, што выклікае, што рэч з'яўляецца рэччу, якой ёсць». Лао Цзы вызначае якасць як «дасканаласць, якой немагчыма дасягнуць, але да якой трэба упарта імкнуцца». Шматаспектны падыход да азначэння якасці зрабілі пачынальнікі канцэпцыі комплекснага кіравання якасцю: Дж.М. Джюрэн, Э. Дэмінг і П. Кросбі. Найбольш вядомае азначэнне Э. Дэмінга трактуе якасць як «штосьці, што задавальняе, а нават захапляе кліента». Таксама лічыць і П. Кросбі, для якога «якасць – гэта адпаведнасць вырабу спецыялізаваным патрабаванням». Кібернетычны падыход да праблемы якасці, які зыходзіць з кваліталогіі, выдзяляе тры погляды на вышэй узгаданую праблему – эканамічны, тэхнічны і грамадскі. Менавіта грамадска-эканамічныя ўмовы прывялі да таго, што канцэпцыі якасці знайшлі запатрабаванне ў такіх навуках, як сацыялогія, псіхалогія, педагогіка ці ствараемая апошнім часам скаліюлогія (школазнаўства).

2. Рэформа школьнай сістэмы павінна спрыяць перабудове (ці нават яе стымуляваць) структуры дзейнасці школы такім чынам, каб якасць яе працы адпавядала спадзяванням усіх яе грамадскіх суб'ектаў: настаўнікаў, бацькоў вучняў, мясцовай грамадскасці ці патэнцыяльным працадаўцам будучых выпускнікоў. Паўстае, такім чынам, пытанне аб фактарах, якія ўплываюць на якасць у асвеце. Найважнейшыя ўмовы якасці адукацыі былі вызначаны па даручэнні міністраў адукацыі Еўрасаюза і ўтрымліваюцца ў Міжнародным дакладзе «Школы і якасць». Назіранні і высновы, якія ў ім змешчаны, не згубілі сваёй актуальнасці. Ключавой умовай якасці ў адукацыі з'яўляецца школьная праграма, выкананне якой павінна гарантаваць кожнаму дзіцяці, незалежна ад яго полу, паходжання, месца жыхарства веды і навыкі на вызначаным і дапушчальным узроўні. Агульная адукацыя павінна ахопліваць такія справы, як праблемы працы і дарослага жыцця, патрабаванняў, якія мае прафесійнае навучанне, механізму рынка працы і ролі прадпрыемстваў у гаспадарцы». Чарговай умовай якасці навучання з'яўляецца ацэньванне і адсочванне поспехаў вучня. Нельга спыняцца толькі на інфармацыі, чаго вучань не ведае і чаго не разумее, абавязкова трэба таксама даведацца пра вытокі гэтага незразумення з тым, каб дзейсна гэта пераадолець. Такім чынам, вынікае, што роля настаўніка ў працэсе дыягностыкі рэзультатаў навучання з'яўляецца вельмі важнай. Інфармацыя, якая выцякае з бягучага кантролю і ацэньвання ўласнай працы і школы, павінна ствараць адпаведныя ўказанні ў памкненні да як найвышэйшай якасці адукацыйных паслуг. Неабходным у працэсе ўдасканалення якасці з'яўляецца развіццё кампетэнцыі і асабістага зацікаўлення настаўнікаў. Новыя патрабаванні, якія ставяцца перад настаўнікамі, патрабуюць адпаведнай падтрымкі і мэтанакіраваных дзеянняў ад органаў адукацыі, задачай якіх з'яўляецца стварэнне ўмоў, спрыяльных для прыцягнення ў прафесію добрых кандыдатаў і больш эфектыўныя дзеянні, якія дазваляюць павышаць кваліфікацыю працуючых настаўнікаў.

3. Істотнай умовай, якая прадвызначае працэс вучэння і навучання, з'яўляецца арганізацыя работы школы, у тым ліку велічыня школы і колькасць класаў. Невялікія школы спрыяюць стварэнню добразычлівай амасферы і пачуцця адзінства, алеж вялікія школы даюць большую магчымасць выбару прадметаў і пазашкольнай дзейнасці. Агульнавядома, што занадта вялікая колькасць вучняў у класе стварае перашкоды ў эфектыўным навучанні і не спрыяе ўсталяванню больш глыбокіх эмацыянальных кантактаў паміж настаўнікамі і вучнямі.

Парадокс, але павышэнне якасці ў адукацыі не абавязкова звязана з астранамічнымі расходамі на адукацыю. Між іншым немагчыма таксама існаванне школы без дастатковых фінансавых сродкаў. На думку стваральнікаў даклада, чатыры папулярныя прапановы па павышэнні стандартаў без абавязковага павялічэння расходаў: больш эфектыўнае размеркаванне і выкарыстанне

педагагічных кадраў; прыцягненне большага ўдзелу бацькоў і спонсараў; апора, прынамсі часткова, на спадзяванні спажыўцоў.

Ніводная з гэтых прапаноў не з'яўляецца беспраблемнай, але кожная варта таго, каб яе сур'ёзна разгледзець. Істотнай рэччу з'яляецца тое, каб усе ўдзельнікі адукацыі ўсведамлялі расходы і імкнуліся да ашчаднасці ўсюды, дзе гэта магчыма, а таксама да такога выкарыстання матэрыялаў, што дае як мага большую адукацыйную карысць.

Імкненне да найвышэйшай якасці ў адукацыі адбываецца на некалькіх узроўнях: на макраўзроўні, які ахоплівае ўсю сістэму адукацыі, на мясцовым узроўні, а таксама можна яго адносіць і да дасягненняў кожнага вучня. Але, як пішуць аўтары даклада, істотай праблемы з'яўляюцца самі школы. Дырэктары школ шукаюць усё лепшых сродкаў і метадаў, якія забяспечаць вышэйшую якасць навучання і развіццё школы. Школы, аб'яднаныя ў сеці Школ якасці АСЦД (ASCD), выкарыстоўваюць адзін з найбольш эфектыўных метадаў кіравання. Гэта перанятая з бізнесу канцэпцыя Усеагульнага кіравання якасцю (УКЯ, Total Quality Management). Яна абапіраецца на пераканне, што супольнае, пастаяннае імкненне і асабістая зацікаўленасць у пастаянным удасканаленні з'яўляюцца абавязковымі, каб магла адбыцца хоць нейкая значная змена. Ініцыятарам усяго гэтага быў лідэр Школ якасці Дж.Дж. Бонстінгл з ЗША, які апошнім часам правёў у некалькіх краінах цыкл лекцый і майстар-класаў для дырэктараў школ і настаўнікаў на тэму выкарыстання УКЯ ў адукацыі. На яго думку, практыку УКЯ можна выкарыстоўваць для ўдасканалення ўсіх аспектаў жыцця школы – ад структуры сістэм адукацыі да штодзённай працы настаўнікаў і вучняў у класе.

4. Падставай змен у Школах якасці з'яўляецца мадэль, прапанаваная Уолтэрам Шыўартам і ўдасканаленая Эдвардсам Дэмінгам. Гэтая мадэль можа прымяняцца з мэтай удасканалення кожнага, па сваім жаданні абранага працэсу. Цыкл Дэмінга складаецца з чатырох этапаў:

- планаванне, г.зн. дакладнае вызначэнне дзеянняў, неабходных для атрымання эфекту вышэйшай якасці,
- дакладнае ажыццяўленне ўсіх пунктаў плану,
- праверка вынікаў з мэтай ацэньвання эфектыўнасці рэалізаванага плану і вызначэння магчымасцей для паляпшэння працэсу,
- удасканаленне працэсу і далейшае планаванне яго развіцця.

Атрыманы эфект спіралі дазваляе сістэматычна мадыфікаваць кожнае чарговае дзеянне, якое вядзе ў выніку да пастаяннага росту і ўдасканалення вынікаў працы школы. Такі падыход да навучання і кіравання школай выкліканы тэзісам, што якасць прадукту прадвызначае паасобны працэс. Адсочванне працэсу і своечасова знойдзеныя памылкі, якія ўзніклі ў ходзе яго рэалізацыі, дазваляюць пазбегнуць прабелаў ў ведах ці адсутнасці трансфармацыі ведаў у неабходныя навыкі.

Працэс увядзення УКЯ немагчымы без удзелу кіраўніцтва школы і органаў адукацыі. Моцнае і паслядоўнае лідэрства вынікае з адказнасці за якасць працэсаў, сістэм і вынікаў, а таксама неабходнасці стварэння агульнасістэмных умоў, якія спрыяюць пабудове філасофіі якасці, заснаванай на даверы, індывідуальнай і калектыўнай актыўнасці і пастаянным імкненні да дасканаласці.

Першым неабходным крокам на шляху ўвядзення УКЯ ў школьныя структуры з'яўляецца пабудова паводзін, накіраваных на якасць. Гэта датычыцца як вучняў, настаўнікаў, так і бацькоў. Асноўным заданнем вучняў з'яўляецца канцэнтрацыя на важнейшых справах, што прадвызначае іх дзеянне, вымушае фармуляваць і імкнуцца да дасягнення пастаўленых мэт на працягу загадзя вызначанага часу. Удзел у гэтым працэсе настаўнікаў і бацькоў дае вучням магчымасць атрымаць адпаведную падтрымку і матывацыю. Агульнае ўсведамленне УКЯ, стварэнне апісання пажаданага стану ў будучыні, вызначэнне задання і перспектывы школы, а таксама выбар стратэгіі і плану яе ажыццяўлення – гэта чарговы крок на шляху дасягнення вышэйшай якасці. Усведамленне патрэбы пастаяннага ўдасканалення павінна вызваць ва ўсёй школьнай грамадскасці адпаведны энтузіязм і волю дасягнення лепшых вынікаў у працы.

Асабістую зацікаўленасць у пастаянным удасканаленні японцы называюць «каізэн» – бясконцай вандроўкай да дасканаласці сваёй уласнай сям'і, сяброў, грамадства і ўрэшце народу і свету. Гэтая канцэпцыя бясспрэчна з'яўляецца суб'ектыўнай, але, як паказвае японскі прыклад, несумненна эфектыўнай. «Наша традыцыйная школа занадта часта замест таго, каб заахвочваць вучняў шукаць у сябе схаваныя таленты і самасцвярджацца на атрыманых дасягненнях, канцэнтруецца на іх няўдачах, недахопах і абмежаваннях. Крывая Гаўса і іншыя інструменты штучна ствараюць сітуацыю, у якой поспех з'яўляецца рэдкасцю, спрыяюць фактычнаму абмежаванню поспехаў – як індывідуальных, так і агульнашкольных. У такой сістэме поспех загадзя абмежава

алькімі «пераможцамі», іншыя ж няўхільна ўспрымаюць сваю працу і саміх сябе як рэднячкоў альбо няўдачнікаў».

5. Істотнай пагрозай для УКЯ з'яўляецца спадзяванне на атрыманне хуткага эфекту. На жаль, ы тэрмін звязаны са зменай сярод настаўнікаў і вучняў сістэмы каштоўнасцяў і перакананняў, кэннем апасенняў і страхаў перад непазбежнымі зменамі, патрабуе часу. У працэсе імкнення вышэйшай якасці істотную ролю адыгрывае таксама ацэнка і кантроль якасці. Ацэньванне не а з'яўляцца напрыканцы працэсу навучання, незалежна ад таго, ці яно датычыцца паасобнай эбнай гадзіны, ці больш доўгага перыяду часу. Выстаўленне адзнак павінна служыць атрыню зваротнай інфармацыі і адказаць нам на пытанне, якое датычыцца абгрунтаванасці прыяемых метадаў і абранага напрамку дзеянняў, а не служыць прыгаворам у форме бала. Гэт заніжэнне прымянення сістэм ацэньвання адбівае ахвоту і не стымулюе высілкі з мэтай дасягня поспеху. Лічбы не ў стане адказаць нам на шмат пытанняў, якія, напрыклад, датычацца заальнення вучняў, бацькоў, настаўнікаў ці якасці, дасягнутай у калектыўнай працы. Як ацаніць эктара? Ці сканцэнтравацца на выкананні ім бюджэту школы, ці ацэньваць яго за школу, якую арыў, за наяўнасць у ёй арганізацыйнага клімату, які спрыяе павышэнню ўласных магчымас і зацікаўленасці? Такія ацэнкі патрабуюць прымянення шмат якога даследчага інструмента, не толькі колькаснага, якія статыстычна дазваляюць нам адказаць – як ёсць, але таксама адаў ацэнкі якасці, якія істотна ўплываюць на добраякаснасць такога ацэньвання.

Прадастаўленне поўнай, добрасумленнай і аб'ектыўнай інфармацыі аб усіх фактарах, якія ываюць на яе якасць, павінна быць зыходным пунктам для паляпшэння якасці. Неабходна, м чынам, збіранне інфармацыі аб усіх галінах школьнай дзейнасці. Гэта патрабуе акрэслення тэрыяў якасці навучання. Імі могуць быць: лёсы выпускнікоў школы; вынікі, атрыманыя вучі на адукацыйных ступенях; рэзультаты, якія атрымоўваюць вучні на конкурсах і алімпіядах; ады ацэньвання вучня; кантакты вучняў з настаўнікамі і аднакласнікамі; школьная дзейнасць дапамозе вучням у цяжкай жыццёвай сітуацыі; павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў; більнасць педагагічных кадраў; школьная база, абсталяванне і фінансы.

Гэта ўсяго толькі некаторыя прыклады. Крытэрыяў якасці працы школы значна больш. Вызнане, якія з іх з'яўляюцца найважнейшымі, патрабуе дыскусіі ўсяго педагагічнага грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ